**Н. М. Зяткіна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 19 г. Магілёва

**Беларускія словы «з-за мяжы»**

**Вымаўлденне і правапіс галосных е, ё, я (2-і ўрок)**

**Урок беларускай мовы ў 5 класе**

**Мэты:**
1. Садзейнічаць засваенню вучнямі правілаў вымаўлення і напісання галосных **е, ё, я** ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах.
2. Удасканальваць уменне вызначаць націскны, першы і другі пераднаціскныя, паслянаціскныя склады ў спрадвечна беларускіх словах, адрозніваць каранёвае **я**, словы іншамоўнага паходжання; пашыраць слоўнікавы запас вучняў, развіваць звязнае маўленне і маўленчы слых.
3. Выхоўваць цікавасць да ўрокаў беларускай мовы, любоў да роднага краю.
**Тып урока:** урок камбінаванай будовы
**Абсталяванне:** Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання. Частка 1/ В. П. Красней [і інш]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014; мультымедыйная прэзентацыя, карткі з заданнямі, тлумачальныя слоўнікі, каляровыя алоўкі.

**Ход урока**

**Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою**
Настаўнік: Прывітанне! Добры дзень! Сядайце!
**Флэшмоб (вітанні па-беларуску)**
1-ы вучань: Добры дзень, добры дзень добрым людзям!
2-і вучань: Дзень добры ў хату!
3-і вучань: Добрага ранку!
4-ы вучань: Добры дзень! Хай дае вам Бог добрае!
5-ы вучань: З панядзелкам вас!
6-ы вучань: Здароў вам у вашу кучку!
7-ы вучань: Маё вам шанаванне!
8-ы вучань: Як вы жывы-дужы на гэткай сцюжы?
Настаўнік: Вітаю вас на ўроку беларускай мовы!
**Паведамленне тэмы ўрока**
Настаўнік: Сёння на ўроку мы працягнем вывучаць правілы вымаўлення і напісання літар е, ё, я. Нам трэба навучыцца правільна вымаўляць і пісаць названыя галосныя ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах. А яшчэ нас чакае сустрэча з нашым родным краем, яго цудоўнай прыродай, выдатнымі мясцінамі і людзьмі.
**Хвілінка чыстапісання**
Настаўнік: Запішыце, калі ласка, у свае сшыткі прыказку:
*Усякая птушка сваё гняздо бароніць.*

Настаўнік: Як вы разумеце сэнс гэтай прыказкі?
Падкрэсліце і растлумачце арфаграмы.
Вызначце, колькі літар і гукаў у словах *сваё, бароніць.*

**Пастаноўка мэт урока**

Настаўнік: Прачытайце, калі ласка, мэты ўрока, якія я вам прапаную. Выберыце мэты, якія вы ставіце перад сабой на ўроку (у вучняў на партах ляжаць рабочыя лісты, у якіх напісаны прапанаваныя мэты).

1. Буду ведаць правілы напісання галосных **е, ё, я** ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах
2. Навучуся граматна пісаць словы з літарамі **е, ё, я**.
3. Атрымаю добрую адзнаку.
4. Буду правільна выконваць заданні.
5. Даведаюся пра значэнне некаторых слоў.
6. Буду ствараць уласныя тэксты з вывучаемымі словамі, каб здзівіць аднакласнікаў.
7. Буду актыўна працаваць на ўроку.

**Праверка дамашняга задання**

Настаўнік: Дома з урыўка з паэмы Якуба Коласа “Новая зямля” (“Дарэктар”), які вучылі на памяць да сённяшняга ўрока літаратуры, вы выпісвалі словы з арфаграмай правапіс літар **е, ё, я.**

Вучань выразна чытае ўрывак. На дошцы – рэпрадукцыі ілюстрацый В. Шаранговіча да паэмы “Новая зямля”.

Адзін вучань запісвае выпісаныя словы на дошцы, другі – зачытвае, трэці – здае настаўніку сваю работу на праверку.

**Актуалізацыя вывучанага**

**1. Паўтарэнне тэарэтычнага матэрыялу.** Вучань расказвае правіла “Правапіс е, ё, я ў спрадвечна беларускіх словах”.

**2. Слоўнікавая практычная работа (словы на дошцы)**

З..лёны, паз..лянець, выл..цець, прыл..цець, п..сняры, дз..сятка, кал..ндар, дал..кавата, дал..чынь, св..ткаваць, пан..дзелак, см..танковы

**3. Узаемаправерка (словы запісаны на дошцы, у вучняў ёсць крытэрыі ацэньвання слоўнікавага дыктанта)**

**Крытэрыі ацэнкі слоўнікавага дыктанта**

| **Бал** | **Колькасць памылак** |
|---|---|
| 1 | 7 і больш |
| 2 | 6 памылак |
| 3 | 5 памылак |
| 4 | 4 памылкі |
| 5 | 3 памылкі |
| 6 | 2 памылкі |
| 7 | 1 памылка |
| 8 | 0 памылак, 2 выпраўленні |
| 9 | 0 памылак, 1выпраўленне |
| 10 | 0 памылак, без выпраўленняў |

**4. Рэфлексія вынікаў дзейнасці.** Вучні пры дапамозе каляровых алоўкаў выказваюць свае адносіны да ўзроўню засваення матэрыялу. Зялёны аловак – усё задавальняе. Жоўты аловак – трэба крыху падвучыць. Чырвоны аловак – матэрыял засвоены няпоўна, патрэбна дапамога.

**Вывучэнне новага матэрыялу**

**1. Інсцэніроўка “Замежная госця”**

Настаўнік: Дама важная такая
Да нас прыехала з-за мяжы.
Нашых правіл не зважае,
Усё па-іншаму пішы.
Словы, што з-за мяжы мы маем,
Пішам і запамінаем.

Вучаніца: Добры дзень, сябры! Я прыехала да вас з-за мяжы і прывезла свае словы. Гэтыя словы таксама ўжываюцца і ў вашай беларускай мове, але яны не падпарадкоўваюцца агульнапрынятым правілам напісання.
Сёння я прывезла да вас словы *апельсін, медаль, пейзаж*. Звярніце, калі ласка, увагу на іх правапіс. Якая літара пішацца ў гэтых словах у першым складзе перад націскам?

**2. Чытанне правіла**

Вучні чытаюць правіла, пераказваюць адзін аднаму змест вучэбнага параграфа.

**3. Гульня “Рыфмаванка”(па ланцужку)**

*Герой, медаль, пенал, зефір,*
*Бензін, педаль, гепард, кефір,*
*Секунда, бегемот, бетон,*
*Берэт, легенда, фельетон,*
*Герань, феномен, вазелін,*
*Гектар, сеанс і апельсін.*

**4. Рубрыка “Этымалагічная даведка”**

Вучаніца: Слова *апельсін* запазычана з галандскай мовы, дзе апель – *яблык*, Сіна – *Кітай*; літаральна апельсін – гэта *кітайскі яблык.*

**Фізкультхвілінка**

Вучань праводзіць фізкультхвілінку:
Як тупну нагой
Ды прытупну другой,
Кругам пакружуся,
Усім людзям пакажуся! (з народнага)

**Замацаванне вывучанага**

**1. Работа з падручнікам**

Пр. 263 (самастойна)
Дзяжурныя па слоўніку вучні тлумачаць значэнні слоў *лекторый, плеяда.*
Праверка па ланцужку

**2. Завочнае падарожжа па Беларусі**. На дошцы чаргуюцца фотаздымкі знакамітых мясцін Беларусі. Пад кожным фотаздымкам напісана слова з

прапушчанай літарай. Вучні запісваюць словы, устаўляюць прапушчаныя літары, тлумачаць правапіс.
Тэатр оперы і балета, бал...рына
Плошча Перамогі, аб...ліск
Брэсцкая крэпасць-г...рой
Дзяржаўнае прадпрыемства “Мінскі метрапалітэн”, м...тро
Магілёўскі драматычны тэатр, м...лодыя, сп...ктакль
Магілёўскі чыгуначны вакзал, п...рон
Гомельскі дзяржаўны цырк, 45-ы с...зон
**3. Творчае замацаванне**
Напісанне міні-сачынення “Што я раскажу пра Беларусь сённяшняй замежнай госці” з выкарыстаннем слоў, якія вывучалі на ўроку.
Гучыць песня “Мой родны кут” (словы Я. Коласа, музыка І. Лучанка) у выкананні вакальна-інструментальнага ансамбля “Песняры”.
**Кантроль ведаў**
1. **Выкананне тэсту.** Вучні выконваюць тэст у рабочых лістах.
   1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару **я**:
   1) в...сёлка
   2) м...дуніца
   3) з...лёны
   4) по...с
   2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару **е**:
   1) дз...вяты
   2) бал...рына
   3) с...рада
   4) дал...чынь
   3. Адзначце рад, у якім усе словы правільна напісаны:
   1) дзявятка, леснічоўка, выляцець
   2) васямнаццаць, ёд, легенда
   3) пейзаж, глядачы, цемнаваты
2. **Самаправерка.**
3. **Рэфлексія вынікаў дзейнасці.** Вучні пры дапамозе каляровых алоўкаў выказваюць свае адносіны да ўзроўню засваення матэрыялу. Зялёны аловак – усё задавальняе. Жоўты аловак – трэба крыху падвучыць. Чырвоны аловак – матэрыял засвоены няпоўна, патрэбна дапамога.
**Выстаўленне адзнак**
Выстаўленне і каменціраванне адзнак
Настаўнік: Вы добра працавалі на ўроку, былі ўважлівыя, творчыя, я спадзяюся, што вы атрымалі карысную інфармацыю і трывалыя веды. Думаю, што дамашняе заданне выканаеце правільна і хутка.
**Дамашняе заданне**
§35, пр. 266
Дадатковае заданне (філворд):
У гэтым квадраце “схаваліся” пяць назваў птушак, якія водзяцца на Беларусі. Знайдзіце іх. Чытаць можна злева направа і справа налева, зверху ўніз і знізу

ўверх, па прамых і ламаных лініях. Тая самая літара можа ўжывацца некалькі разоў.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Ь** | **Д** | **З** | **Я** | **Ц** |
| **Ц** | **З** | **Я** | **Л** | **Е** |
| **Ы** | **Ю** | **Л** | **Я** | **Ц** |
| **С** | **Н** | **І** | **Р** | **Я** |
| **Я** | **Я** | **Г** | **У** | **К** |

**Рэфлексія**

Зварот да мэт урока, якія вучні ставілі ў пачатку ўрока перад сабой.

Выбар смайліка, які адпавядае ўсведамленню вынікаў сваёй дзейнасці на ўроку.

**Развітанне**

Настаўнік: Вось і заканчваецца наш урок. Вялікі дзякуй за працу! Жадаю вам усяго найлепшага!

**Флэшмоб “Развітанні па-беларуску”**

1-ы вучань: Аставайцеся жывенькія-здаравенькія!

2-і вучань: Бывайце здаровы, жывіце багата!

3-і вучань: Затым прашчавайце!

4-ы вучань: Здаровы бывайце, мяне не забывайце!

5-ы вучань: Усяго добрага!

6-ы вучань: Усяго найлепшага!

## Літаратура

Беларуская мова: вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. / В. П. Красней [і інш] – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014. – 1 ч.

Беларускі фальклор у школе. 1-ы клас: дапам. для настаўніка / І. І. Сучкоў, Ф. І. Таранава, Л. У. Рута, В. В. Куржалава. – Мінск: Народная асвета, 1996. – 176 с.

Валочка, Г. М. Вывучаем беларускі правапіс. 5-9 кл.: вучэб.-метад. комплекс / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 176 с.

Солахаў, А. В. Падарожжа ад А да Я: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. В. Солахаў. – Мінск: Зорны Верасок, 2012. – 263 с.

Солахаў А. Правапіс галосных е, ё, я і спалучэнняў іё(ыё), ія(ыя) // Роднае слова. – 2000. - № 7. – С. 66

